УДК 351.854/.855-027.21:[001.4+341.16]

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ПАНЯЦЦЯ "НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА" Ў АЙЧЫННЫМ І ЗАМЕЖНЫМ ГУМАНІТАРНЫМ ДЫСКУРСЕ

**Смолік А. І.**
Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
(г. Мінск, Беларусь)

Анатацыя: У артыкуле абагульняюцца пэўныя навукова-метадычныя падыходы беларускіх і замежных навукоўцаў да вызначэння сутнасці і зместу катэгорыі фундаментальнай культуралогіі "нематэрыяльная культурная спадчына", упершыню ўведзеная ЮНЕСКА ў тэкст Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Аўтар адстойвае правамернасць інтэрпрэтацыі дадзенага паняцця з улікам нацыянальнай спецыфікі культуры розных краін свету. Аналізуецца трактоўка тэрміна таксама дзяржаўнымі і навуковымі інстытуцыямі Беларусі.

Ключавыя словы: аб'ект, закон, Канвенцыя, каштоўнасць, культура, нематэрыяльная культурная спадчына, ЮНЕСКА.

Summary: This paper summarizes the specific scientific and methodological approaches of the Belarusian and foreign scientists to the determination of the nature and content of the fundamental categories of cultural studies the intangible cultural heritage, first introduced in the text of the UNESCO Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage. The author defends the validity of the interpretation of this concept taking into account national specificities of culture around the world. It analyzes the interpretation of the term as government and academic institutions in Belarus.

Keywords: object, law, convention, values, culture, intangible cultural heritage by UNESCO.

Гісторыя навуковага асэнсавання сутнасці і зместу нематэрыяльнай культурнай спадчыны пачынаецца з пачатку 2000-х гг., калі ў Парыжы на 32-й сесіі Генеральнай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (далей – ЮНЕСКА) у кастрычніку 2003 г. была прынята Міжнародная канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – НКС) [5]. У сувязі з фіксацыяй дадзенага паняцця міжнародным прававым актам у навуковых колах распачаліся дыскусіі. Справа ў тым, што да гэтага часу дэфініцыі "нематэрыяльная культурная спадчына" не існавала. У гуманітарным дыскурсе і нарматыўна-прававой сферы разглядаліся асобныя яе аспекты (абрады, традыцыі, фальклор і г.д.) альбо НКС абазначалася тэрмінамі "духоўныя каштоўнасці", "гісторыка-культурная спадчына".

Тэрмін "нематэрыяльная спадчына" увайшоў у культуралагічны ўжытак з германа-раманскага моўнага асяроддзя. Этымалогія англійскага слова *heritage*, якое перакладаецца на беларускую мову як спадчына. У сярэднія вякі ў Англіі тэрмінам *heriter*, (ад лацінскага *hereditare*, *hered-*, *heres heir* – спадкаемец, пераемнік, прадаўжальнік). Асноўныя значэнні дадзенага слова: а) уласнасць, якая перадаецца ў спадчыну; б) нешта, набытае ад папярэднікаў, сінонім «legacy» мае выражаную юрыдычную інтэрпрэтацыю; в) традыцыі. Паходжанне тэрміна "нематэрыяльная" таксама звязана з англійскай, французскай і іспанскай мовамі. Англійскі тэрмін *intangible* літаральна азначае "неасязальны", эквівалентам яму служыць у французскай і іспанскай мовах *immaterial*, *inmaterial*, што азначае "нематэрыяльны". Шэраг лінгвакультуролагаў (А. Дэвале, Т. С. Кур'янава, Ф. Мерас і інш.) ставяць пад сумненне поўную адэкватнасць тэрмінаў *intangible # immaterial*. У заходнееўрапейскім дыскурсе вельмі часта ў тэорыі і практыцы побач з тэрмінам "нематэрыяльнае" (non-material) выкарыстоўваецца тэрмін "неасязальнае" (intangible). Гэтым падкрэсліваецца, што размова ідзе пра артэфакты, не арэчаўленыя ў прадметнай мове [8; 9; 10]. Шырока паняцце "нематэрыяльная спадчына" выкарыстоўваецца ў азіяцкіх краінах, перш за ўсё у Кітаі і Японіі, з мэтай дакладнай перадачы непрадметных форм традыцыйнай культуры праз яе носьбітаў, у выніку чаго ўзнікла яшчэ адно паняцце "жывыя скарбніцы чалавецтва" (living human treasures) [6; 7].

Аналіз прац беларускіх навукоўцаў і нарматыўна-прававых актаў, якія тычацца аховы культурнай спадчыны, паказвае, што ў іх рэдка ўжываецца канцэпт "нематэрыяльная культурная спадчына". Так, у законе "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" выкарыстоўваюцца такія пняцці, як "нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці" і "нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека" [1, арт. 1]. У фундаментальнай культуралогіі пад культурнымі каштоўнасцямі разумеецца сукупнасць найбольш адметных па сваіх якасцях твораў 0інтэлектуальнай, мастацкай і рэлігійнай творчасці. У гэты пералік таксама ўваходзяць архітэктурныя і іншыя збудаванні, унікальныя творы рамёстваў, увесь набор археалагічных і часткова этнаграфічных рарытэтаў з нагоды іх старажытнасці. Культурнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца таксама пэўныя квінтэсэнцыі сацыяльнага вопыту грамадства, у межах якіх сабраны найбольш апраўдаўшыя сябя і паказаўшыя найбольшую сацыяльную эфектыўнасць прынцыпы ажыццяўлення жыццядзейнасці: норавы, звычаі, стэрэатыпы, ментальнасць, узоры паводзін, ацэнкі, вобразы, інтэрпрэтацыі і інш.

Такім чынам, паняцце "нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці" ахоплівае шырокае кола з'яў і працэсаў сучаснай жыццядзейнасці людзей, у той час як у Канвенцыі 2003 г. канкрэтна абазначаны артэфакты культуры, якія з'яўляюцца аб'ектамі НКС: "Звычаі, формы ўяўленняў і выражэння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы" [5].

Такім жа аб'ёмным з'яўляецца і паняцце "нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека". Пад імі ў першую чаргу неабходна разумець спецыялізаваную сферу культуры, якая функцыянальна выконвае задачы інтэлектуальна-пачуццёвага адлюстравання быцця ў мастацкіх вобразах, г. зн. усе віды мастацтва, у тым ліку і сучасныя, а не толькі традыцыйныя. Такая інтэрпрэтацыя паняцця "нематэрыяльная культурная спадчына" навуковай супольнасцю і прадстаўнікамі юрыспрудэнцыі Беларусі, на наш погляд, правамерна, таму што дадзены падыход да паняцця, сфармуляраванага ЮНЕСКА, адлюстроўвае беларускі нацыянальны аспект праблемы захавання НКС і таго вялікага значэння, якое яна мае для развіцця беларускага грамадства. Нацыянальная культурная спадчына з'яўляецца ўнікальнай для кожнай краіны, і Рэспубліка Беларусь імкнецца прадставіць лепшыя, найбольш значныя ў аксіялагічных адносінах артэфакты на міжнародны ўзровень прадстаўніцтва.

Нягледзячы на розную інтэрпрэтацыю дэфініцыі НКС, адчуваючы яго недасканаласць і ўмоўнасць, прадстаўнікі розных сацыяльна-гуманітарных навук актыўна карыстаюцца разглядаемым тэрмінам для адрознення аб'ектаў матэрыяльных і прыродных. Дарэчы, узорам для канцэпту "нематэрыяльная спадчына" паслужыла паняцце "спадчына матэрыяльная", якое звычайна не абазначаецца экспліцытна як "матэрыяльнае", але падраздзяляецца на культурнае і прыроднае.

Акрамя дыскусій, выкліканых неадназначнасцю перакладу дадзенага тэрміна, не аслабла "дыскурсіўная фаза" спрэчак адносна зместу НКС. Яе вызначэнне падрабязна і канкрэтна ўтрымліваецца ў Канвенцыі 2003 г. У 2-м артыкуле даецца наступнае яе вызначэнне: да нематэрыяльнай культурнай спадчыны адносяцца звычаі, формы ўяўлення і выражэння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая спадчына праяўляецца ў: а) вусных традыцыях і формах выражэння, уключаючы мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны; б) выканальніцкім майстэрстве; в) звычаях, абрадах, святах; ведах і звычаях, якія адносяцца да прыроды і сусвету; г) ведах і навыках, звязаных з традыцыйнымі рамёствамі [5, арт. 2].

Дадзенае паняцце ў трактоўцы ЮНЕСКА не ўсімі навукоўцамі ўспрымаецца адназначна. Так, расійскі культуролаг М. Е. Каўлен прытрымліваецца іншага вызначэння. На яе думку, пад НКС неабходна разумець сукупнасць заснаваных на традыцыі форм культурнай дзейнасці і выражэння, якія фарміруюць у суб'ектаў чалавечай супольнасці пачуццё самабытнасці і пераемнасці і прызнаюцца каштоўнасцю. Яна лічыць, што ў паняцце "нематэрыяльная спадчына" патрэбна ўключаць як аб'екты спадчыны, так і способы яе трасляцыі, сацыяльныя механізмы перадачы традыцыі ад чалавека чалавеку. Адзінкай вымярэння спадчыны, на яе думку, выступае аб'ект нематэрыяльнай спадчыны [3, с. 62]. Аналагічнага падыходу да выяўлення сутнасці НКС прытрымліваецца таксама аўстралійскі археолаг Р. Гарысон, які сцвярджае, што нематэрыяльную спадчыну неабходна раз-

глядаць як працэс збірання прадметаў і практык, якія выступаюць у якасці люстэрка для сучаснасці, звязанага з пэўным наборам каштоўнасцей, якія суб’екты культуры жадалі б узяць у будучае [10, с. 4]. Літоўскі гісторык Р. Чэпайтэнэ таксама схільна ўяўляць НКС як працэс стварэння значэнняў, дзякуючы якім ідэнтычнасць і сацыяльныя каштоўнасці становяцца спрэчнымі, пацвярджаемымі ці адхіленымі [8]. Кітайскія культурныя антрапалогіі Лю Чжуан і Му Яньлі адзначаюць, што канцэпцыя ЮНЕСКА не з’яўляецца самадастатковай у навуковых колах Кітая. Праблема заключаецца ў разуменні тэрміна “нематэрыяльны”. Шэраг кітайскіх этнолагаў лічаць, што НКС раўназначна “духоўнай культуры”. Такі падыход да сутнасці нематэрыяльнай спадчыны заснаваны на самаідэнтыфікацыі суб’екта культуры, які павінен пераканацца ў тым, што для яго пэўны артэфакт культуры з’яўляецца духоўнай каштоўнасцю, у адваротным выпадку спадчына будзе перапынена, і такі аб’ект культуры нельга аднесці да НКС.

Гарачай тэмай у культуралагічных колах стала пытанне аб прадстаўніках гуманітарных навук, якія павінны займацца даследаванне НКС. Шэраг еўрапейскіх навукоўцаў схільны лічыць, што нематэрыяльная спадчына – гэта сфера этналогіі і антрапалогіі. Такога погляду, напрыклад, прытрымліваюцца антраполагі С. А. Аруцюнаў, Ю. В. Брамлей, А. Дэвале, Жуан Леал, Т. С. Кур’янава, П’етра Клемэнтэ, К. В. Чыстоў і інш. Так, А. Дэвале пераканаяны, што дадзеныя з’явы даўно вядомы этнолагам, якія ўжо больш стагоддзя фатаграфуюць, запісваюць, здымаюць цырымоніі, святы, танцы, працэсы работы майстроў ці проста фрагменты паўсядзённага жыцця [9, с. 10].

У гуманітарным дыскурсе шырока распаўсюджаны яшчэ адзін погляд на праблему крытычнага даследавання нематэрыяльнай спадчыны, згодна з якім роля антрапалогіі прызнаецца толькі ў шэрагу астатніх гуманітарных дысцыплін. Прыхільнікі дадзенай пазіцыі лічаць, што феномен нематэрыяльнай культурнай спадчыны з’яўляецца хутчэй культуралагічнай і гістарычнай практыкай, вартай спецыяльнага вывучэння. Р. Чэпайтэнэ прытрымліваецца міждысцыплінарнага падыходу да даследавання НКС. На яе думку, даследаванне нематэрыяльнай спадчыны павінна засноўвацца не толькі на класічнай трыядзе археалогіі, архітэктуры і гісторыі, традыцыйна звязаных з матэрыяльнай спадчынай, а і на такіх дысцыплінах, як антрапалогія, геаграфія, культуралогія, музеялогія, педагогіка, сацыялогія, эканоміка і інш. [8, с. 173].

Расійскія даследчыкі артэфактаў НКС Т. П. Калугіна, Л. А. Клімаў, М. Е. Каўлен , А. М. Масцяніца, К. Я. Рыбак, Э. А. Шулепава і інш. адстойваюць пазіцыю, згодна з якой навуковая распрацоўка праблем НКС павінна адбывацца ў рамках музеязнаўства. Так, Л. А. Клімаў сцвярджае, што музей у адносінах да артэфактаў НКС выступае як складаны кадзіруючы механізм, “які ажыццяўляе адбор з’яў культуры, іх вывучэнне і перадачу” [4, с. 7]. Аналагічнай пазіцыі прытрымліваецца і шэраг такіх беларускіх культуролагаў і гісторыкаў, як А. А. Гужалоўскі, Т. А. Джумантаева, А. М. Калбаска, С. К. Кананові́ч, І. Г. Лупашка і інш. Яны лічаць, што асноўнай задачай інстытуцый Рэспублікі Беларусь з’яўляецца музеефікацыя аб’ектаў НКС, экспанаванне іх на выставах.

У названых пунктах гледжання патрэбна адзначыць недагляд. У разважаннях навукоўцаў размова ідзе пра гісторыка-культурную спадчыну ў цэлым, а толькі не пра нематэрыяльную спадчыну.

Акрамя праблемы вызначэння дысцыплінарных межаў даследавання артэфактаў НКС, маюцца і іншыя дыскусійныя праблемы. У прыватнасці, на працягу многіх гадоў не сціхаюць спрэчкі адносна навуковых падыходаў да патрыманалізацыі нематэрыяльнай спадчыны. Так, расійскія культуролагі М. Я. Кабіцкі і М. У. Калмыкова, зыходзячы з радыкальных поглядаў, сцвярджаюць, што вылучэнне з артэфактаў культуры аб’ектаў нематэрыяльнай спадчыны з’яўляецца вынікам глабалізму, які мае негатыўныя наступствы, таму што заходнія краіны навязваюць астатнім цывілізацыям і культурам сэнсы, каштоўнасці і дыскурсы еўропацэнтрызму [2, с. 136]. Р. Чэпайтэнэ звяртае ўвагу на такі міжцывілізацыйны парадокс у галіне НКС, як змест “Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва”, які, на яе погляд, адлюстроўвае дваякія стандарты. Так, еўрапейскую культуру ў ім прадстаўляюць у асноўным толькі феномены, звязаныя з фальклорам, у той час як усходнія краіны ў сваёй большасці прадстаўлены артэфактамі высокай культуры (напрыклад, тэатрам ценяў і операй Кунку ў Кітаі, тэатрам Нагаку ў Японіі).

Такое разыходжанне ў поглядах, як нам падаецца, абумоўлена рознымі падыходамі да інтэрпрэтацыі аўтэнтычнасці ў краінах Захаду і Усходу. Гэта дазваляе экспертам НКС па-рознаму канструяваць артэфакты традыцыйнай культуры. Зыходзячы з мясцовага кантэксту аб’ектаў НКС, эксперты праводзяць дваякую аперацыю: декантэкстуалізацыю і рэкантэкстуалізацыю. У выніку такіх маніпуляцый яны пераўтвараюцца ў традыцыю, а з праяў грамадскага і культурнага жыцця розных сацыяльных груп – у знакі ідэнтычнасці, з аб’ектыўных аспектаў культуры – у суб’ектыўныя ідэнтытарныя эмблемы.

У сувязі з канструяваннем традыцыйнага ўзнікае праблема канцэпту “аўтэнтычнасці” і крытэрыяў, якія б дазвалялі адносіць тыя ці іншыя працэсы і з’явы да аб’ектаў НКС. М. Е. Каўлен і беларускі філосаф Э. К. Дарашэвіч лічаць яго надзвычай важным. На іх думку, асноўнымі метадамі работы з аб’ектамі НКС павінны быць толькі тыя, з дапамогай якіх магчыма выявіць арыгінальнасць артэфакта. Аналагічных поглядаў прытрымліваецца і кітайскі філосаф Лю Куйлі, які мяркуе, што пры вывучэнні аб’екта НКС неабходна зыходзіць з высвятлення, ці з’яўляецца ён пастаянным у часе і прасторы [4, с. 129]. Прыхільнікі такога падыходу да патрыманалізацыі артэфактаў НКС зыходзяць з таго, што культурныя працэсы і з’явы пастаянна змяняюцца з развіццём і прагрэсам гістарычнай эпохі. Адны з іх знікаюць назаўсёды, таму што больш не сумяшчаюцца з новым сацыяльным асяроддзем. Адначасова ёсць і такія, якія працягваюць дэманстраваць сваю моцную жыццяздольнасць альбо набываць новае развіццё ў розных праявах. Разам з афіцыйнымі крытэрыямі ЮНЕСКА крытэрый аўтэнтычнасці, на іх погляд, дазволіць больш аб’ектыўна ажыццяўляць працэс вызначэння артэфакта спадчыны. Дарэчы, у законе “Аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей” падкрэсліваецца, што аб’екты НКС катэгорыі А павінны ўтрымліваць поўную аўтэнтычнасць і дакладнасць, быць безумоўнымі і нязменнымі [1, арт. 16].

Невыразнасць фармулёўкі суб’екта НКС у тэксце Канвенцыі 2003 г. спарадзіла вострую дыскусію вакол дылемы “індывідуалізм/халізм”. Справа ў тым, што ў тэксце пры вызначэнні тэрміна “нематэрыяльная спадчына” гаворыцца, што артэфакты НКС узнаўляюцца супольнасцямі і групамі. Дадзены групавы падыход не адлюстроўвае складанай рэальнасці, якую ўяўляе кантэкст бытавання спадчыны. Небяспечнасць у адносінах НКС заключаецца ў тым, што можа быць у новай форме ўзноўлена халістычная схема, якая, аперыруючы няпэўнымі калектыўнымі суб’ектамі, з аднаго боку, заменіць канкрэтных носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны пэўнай супольнасцю (напрыклад, грамадствам), а з другога – будзе спараджаць уласніцкі індывідуалізм, які імкнецца прадставіць спадчыну як эксклюзіўную. Улічваючы гэту акалічнасць, у кітайскіх нарматыўна-прававых дакументах тэрміны “групавое” і “індывідуальнае”, якія спараджаюць невыразнае вызначэнне нацыянальных і культурных межаў, заменены на паняцці “народы ўсіх нацыянальнасцей”, што падкрэслівае нацыянальныя атрыбуты НКС. У 18-м артыкуле Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей” акцэнтуецца ўвага на дзяржаўнай уласнасці нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека. Па рашэнні Міністэрства культуры яго аб’екты могуць перадавацца пэўным юрыдычным асобам [1, арт. 18].

Такім чынам, прааналізаваўшы погляды айчынных і замежных навукоўцаў у галіне захавання нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека (НКС), можна канстатаваць, што дэфініцыя “нематэрыяльная культурная спадчына” ў сучасным гуманітарным дыскурсе новая, яшчэ праходзіць працэс канцэптуальнага навукова-тэарэтычнага і юрыдычнага афармлення. Панарама айчынных, заходнееўрапейскіх і ўсходнеазіяцкіх даследчыкаў НКС неаднастайная і характарызуецца пэўнай міждысцыплінарнай раз’яднанасцю, а часам і адрывам ад найноўшых тэндэнцый сусветнай навукі. Навуковая распрацоўка праблем нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Еўропе і Азіі ажыццяўляецца галоўным чынам у межах музеезнаўства, гістарычнай культуралогіі,

юрыспрудэнцыі і этнаантрапалогіі. Прадстаўнікі гэтых галін навукі ўзялі на сябе ролю асноўнай прафесійнай групы, выступаючай у якасці даследчыкаў і экспертаў у дадзенай сферы. У сувязі з гэтым мяркуем, што інтэнсіўны разгляд і абмеркаванне пытанняў нематэрыяльнай спадчыны будзе садзейнічаць паглыбленаму разуменню дадзенай фармальна новай з'явы і выпрацоўцы эфектыўных практык і стратэгій яе выкарыстання.

**Літаратура:**


1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З; в ред. Закона Респ. Беларусь от 28.12.2009 г. // Консультант Плюс : Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.
2. Кабицкий, М. Е. Организации Слоу Фуд и Терра Мадре и их деятельность по защите кулинарных и аграрно-промысловых традиций / М. Е. Кабицкий, М. В. Калмыкова // Традиционная культура: науч. альм.– 2016. – № 2. – С 133–138.
3. Каулен, М. Е. Научные основы музеефикации нематериальных и средовых объектов в контексте музееведения / М. Е. Каулен // Вест. Моск. Гос. ун-та культуры и искусств. – 2006. – № 4. – С. 61–65.
4. Климов, Л.А. Мусейон и интердисциплинарность / Л. А Климов // Музей. – 2012. – № 4. – С. 42–45.
5. Конвенция об охране нематериального культурного наследия [Электронный ресурс]: принята 17 октября 2003 г. 32-й сессией Генеральной конференции ООН по вопросам образования, науки и культуры (ЮНЕСКО). URL: http://unesdoc.unesco.org/images/0013/001325/132540r.pdf (дата обращения: 18. 12. 2018).
6. Лю Куйли. Небо – Земля – Человек, или Время – Пространство – Обряд. Охрана нематериального культурного наследия по отношению к созданию экокультуры / Лю Куйли // Традиц. культура. – 2015. – № 4. – С. 127–131.
7. Лю Чжуан. Анализ и разъяснение понятия НКН / Чжуан Лю, Яньли Му // Юго-Западный университетский журнал: гуманитарные и общественные науки. – 2008. – № 5. – С. 180–187.
8. Чепайтене, Р. Культурное наследие в глобальном мире / Р. Чепайтене. – Вильнюс: ЕГУ, 2010. – 217 p.
9. Desvallées, A. La muséologie et les catégories de patrimoine immatériel. Questions de terminologie, à propos de intangible heritage / patrimoine immatériel et patrimoine intangible / A. Desvallées // Museology and Intangible Heritage. International Symposium, org. by ICOFOM. 20th General Conference of ICOFOM. Complete edition of the papers. Seoul: ICOM – München: MPZ. – 2004 – Pp. 7–14.
10. Harrison, R. Heritage: Critical approaches. Abingdon / R. Harrison. – New York: Routledge, 2013. – 356 p.